


Жыве Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№170 (683) 31 жніўня 1993 г. Аўторак. | Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. | Тыраж 502252 экз. | Кошт у розніцу — 10 руб.

ФАКС

Вкратце

Вчера Чрезвычайный и Полномочный Посол Республики Беларусь в Российской Федерации В.Д.Даниленко вручил памятные знаки "Партизан Беларуси" группе участников партизанского движения на территории нашей республики, которые живут в Москве.

Встреча прошла в белорусском посольстве.

❑

Участие в торжествах по случаю открытия в Вильнюсе белорусской гимназии примет сегодня министр образования Республики Беларусь Виктор Гайсенок.

Министр вручит литовским коллегам учебники, книги, методическую литературу на белорусском языке.

❑

В Минске прошло совещание, в котором вместе с организаторами из Министерства обороны приняли участие представители Республиканского совета ветеранов войны, труда и вооруженных сил, союза бывших воинов-афганцев, других ведомств и общественных организаций.

Участники совещания договорились о конкретных формах координации действий по возрождению военно-патриотического воспитания молодежи.

❑

Между Сберегательным банком Беларуси и Стройсбербанком города Швебиш-Халл (ФРГ) ведутся переговоры о создании в Минске совместного белорусско-германского банка для финансирования жилищного строительства.

❑

Поспорить о том, чьи измерения более точные и как должна развиваться метрологическая служба в современном мире, соберутся осенью этого года метрологи Германии и Беларуси.

В Минске с 6 по 8 октября пройдет семинар, финансирование которого взяло на себя правительство Германии.

❑

В прошлую субботу стартовал белорусский фестиваль творчества инвалидов "Творчество — путь к себе".

По программе фестиваля в течение месяца во всех областных центрах республики будут проходить конкурсы, во время которых инвалиды покажут зрителям и жюри свое творчество.

Приятное с полезным

Своими усилиями возвел "мостик" дружбы между Францией и Беларусью советник мэра небольшого города Фонтен — спутника Гренобля — месье Андре Поттон.

Прослышав о живописном месте под названием Браслав, ветеран ушедшего в прошлое общества Франция—СССР решил действовать самостоятельно и вместе с женой и друзьями — супружеской парой — двинулся в путь. Итогом путешествия стало подписание документов о сотрудничестве двух городов. Скоро в Фонтен с ответным визитом поедет делегация браславчан. Среди них — учителя, журналисты, предприниматели.

Сергей ОЗЕРНЫЙ.

Витебск заказывает музыку

Филиал совместного предприятия "Русско-немецкая музыка" (Санкт-Петербург) открыт в Витебске.

Партнером выступила местная фирма "Белотон", которая первой в республике занялась выпуском грампластинок.

В ближайших планах "Белотона" и его компаньонов в России и Германии — диски с песнями бельгийца Криса де Бурга, произведения французского композитора Жан-Мишеля Жара, пластинка "Классика для любовников" и другие издания высокого класса.

Степан СТАРОЖИЛ.

Не поставить телегу впереди лошади

Непростые проблемы земельной реформы на протяжении двух дней обсуждали участники республиканской научно-практической конференции, которая проходила на базе коллективного сельскохозяйственного предприятия "Остромечево" Брестского района.

Заместитель Председателя Совета Министров Беларуси Александр Бокач, который выступил на конференции, поддержал высказаную многими участниками дискуссии мысль о том, что теперь ни в коем случае нельзя разрушать колхозы и совхозы. Другое дело — нужно вести реформирование экономических отношений внутри этих структур. При этом линия правительства остается прежней: оказывать всяческую поддержку и фермерским хозяйствам.

Иван КУКСО.

Дежурная часть

Грабеж среди ночи

Вчера в полночь в милицию Речицы обратился студент политехнического института. Трое парней с пистолетом забрали у него 500 долларов США.

Один из грабителей был быстро задержан. Двое других скрылись.

Всего в минувшее воскресенье в республике были зафиксированы три грабежа и один разбой. Однако только в одном случае преступникам удалось "пропасть без вести".

Закосили под "капусту"

В воскресенье в Минске изъяты фальшивая купюра в 100 немецких марок и две — в 10 и 100 долларов.

Стодолларовую купюру пытались сбыть у обменного пункта по проспекту Скорины.

Что ни лисичка, то — "зайчик"!

Впервые за всю обозримую историю Россонского района в нем появились миллионеры.

Их доходы в прямом смысле слова выросли в лесу, на обильных нынче грибных угодьях. Потребительская кооперация, установив привлекательную цену — до 3 тысяч рублей за килограмм лисичек — сумела с помощью поклонников "третьей охоты" заготовить 20 тонн деликатесного продукта. А всего в системе Витебского облпотребсоюза уже собрано и переработано 40 тонн грибов.

Сергей БУТКЕВИЧ.

Сел на иглу. Со СПИДом

Результаты лабораторного исследования выявили еще одного больного СПИДом в Беларуси. Им оказался человек, которого милиция задержала с маковой соломкой.

Болезнь прогрессирует, и наркоман, находящийся в изоляторе временного содержания, может не дожить до суда.

С 1987 года в Беларуси зарегистрированы 94 носителя ВИЧ-инфекции. Шестерых заболевших в живых уже нет...

Виктор ФЕДОРОВИЧ.

День независимости Молдовы отмечали не только в Молдове

В минувшую пятницу у молдавского народа был праздник — День независимости. Отмечался он и на белорусской земле.

В приеме, устроенном постоянным представительством Молдовы, приняли участие члены Президиума Верховного Совета Республики Беларусь М.Слемнев, Б.Савицкий, первый заместитель Председателя Совета Министров М.Мясникович, заместитель Председателя Совета Министров Н.Костиков, министры, деятели культуры, науки, передовики производства, представители дипломатического корпуса, журналисты. В ответ на речь постоянного представителя Молдовы в Беларуси Д.Мунтяну первый заместитель Председателя Совета Министров республики М.Мясникович пожелал молдавскому народу успехов в строительстве суверенного государства.

Иван ПЕТРОВСКИЙ.

"Филипс" связался с нашей армией

Возможно, что скоро некоторые воинские части Беларуси будут оборудованы телефонной аппаратурой фирмы "Philips".

Переговоры об этом в течение недели вела делегация руководителей этого германского концерна с Министерством обороны. Обсуждалась также возможность производства аналогичной техники на Минском заводе электронных вычислительных машин им. Орджоникидзе.

Болтун — находка для Минсвязи

Подорожают с 1 сентября междугородные и международные переговоры.

Теперь минута телефонного разговора в пределах области будет стоить 10 рублей, республики — 20, с Израилем — 3500, США — 2700.

Почти в два раза поднимает стоимость своих услуг и почта.

Антон ЗВОНКОВ.

... Покой нам только снится

Оказывается, не только премьеры и председатели прекращают свои отпуска из-за государственных дел.

Как стало известно, вчера на работу досрочно вышел министр энергетики Беларуси Валентин Герасимов. Причина — возникшие проблемы в энергоснабжении республики. Теперь их станет меньше?

Сергей ПОЛЕШУК.

Кто подложил свинью буренкам?

Вчера ночью в колхозе им. Горького Ивацевичского района сгорело более трехсот тонн тюкованного сена и соломы.

Предполагается, что причина пожара — поджог. Ведется следствие.


Всего же за минувшую неделю огонь "съел" в республике около восьмисот тонн соломы и сена.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН и РИД.

Бывай, лета!







Там, дзе не чутны горада шум...

Янка БРЫЛЬ.
("Усё, што ўражае")
Фота Сяргея ГРЫЦА

Вернісаж у кустах ядлоўцу — павуцінне. У сонцы і расе. Скрозь павуцінне, дзе толькі можна яго пачапіць. Добра думаць пра мікрасветы, якія мінаеш, пра маэстра, што іх ствараюць.

❑

Наша цудоўнае лета. Багатае жыта, у якім заўсёды хочацца паляжаць. Трава — у густой, раскошнай квецені купалля, рамонкаў, вогнікаў — небывала добрая, ледзь не да пояса. Лён дацвітае сваім блакітна-дробненькім цветам, што пры дарозе шчодра асыпаўся на пясок.

❑

Дарога каля зялёнай сцяны пераважна сасновага лесу. Ціхага, мокрага. Узбоч дарогі — многа камення, што, як лішняе, выкачана сюды за шмат гадоў арацьбы. Жыта — радаснае мноства хлеба, узнятае над зямлёй у недаспелых яшчэ каласах. Мокры рамонак, хоць дажджу ўжо даўнавата няма, паапускаў пялёсткі абапал жоўтых лысін. Многа яго — і на ўзмежку, і ў жыце, радчэйшы пры дарозе.

У такой адзіноце, такой цішыні — проста малітвенны настрой душы. Жыццё бачыцца нібы наскрозь ад пачатку і наперад, што было і што яшчэ трэба паспець завяршыць.

Не всё так плохо!

Как в Бобруйске появилось 5 тысяч миллионеров, и что от этого имеет государство

Ярослав ШИМОВ

Недавно бобруйские деревообработчики на альтернативной основе из трех кандидатов избрали президента акционерного общества открытого типа "Фандок". Так отныне будет называться известный в республике "Бобруйскдрев" — одно из крупнейших деревообрабатывающих предприятий Беларуси.

42-летний Владимир Таранов, ставший президентом новоиспеченного акционерного общества, — человек опытный и в "Фандоке" не новый. Объединение он возглавляет десятый год.

Осенью 1991 года пожелавший свободно плыть по волнам формирующегося рынка "Бобруйскдрев" "откупился" от государства, выплатив ему 31 миллион рублей. Каждый из более чем пяти тысяч рабочих и служащих в течение года внес 6 тысяч рублей, став пайщиком народного предприятия, его совладельцем. Доля каждого постоянно индексируется. Когда она достигла 200, затем — 300 тысяч рублей "на брата", кое-кто предпочел забрать свои деньги. Нужд ведь у людей много: одному надо мебель купить, второму — телевизор... Личный же пай тех, кто решил не требовать "отдать свои кровные" немедленно (таких на "Фандоке" большинство), в этом году преодолел миллионную отметку. Впрочем, о том, что миллион в условиях бешеной инфляции значит не очень много, лишний раз напоминать, наверное, не стоит. Так что нынешний "Фандок" — клуб миллионеров, "деревянных" в прямом и переносном смысле.

Тем не менее предприятие пока не бедствует. Спад производства, по словам его руководителя, на "Фандоке" мизерный — на 1,2 процента в первом полугодии этого года по сравнению с тем же периодом предыдущего.

Зачем же нужны очередные новации, переход к акционерному обществу открытого типа, если "Фандок" вроде бы держит удар экономического кризиса?

— Держать-то держит, но до поры до времени, — говорит В.Таранов. — Сейчас цены на сырье, энергоносители, на все, что нам нужно, растут куда быстрее, чем прибыль предприятия. И если бы не работа на экспорт, мы бы уже обанкротились. Пока доля экспортной продукции высока — 36 процентов, в Германии и Австрии, Италии и Англии пользуется спросом то, что мы производим. Но живет "Фандок" все-таки в постоянных поисках средств, которые нужны не только на развитие производства (в него мы в прошлом году вложили две трети всей полученной прибыли), но и на социальную сферу. На народном предприятии, владельцами которого являются только люди, работающие на нем, всегда возникает соблазн все проесть. Нет притока капитала извне. Такое предприятие, хоть и имеет преимущества перед государственным, является закрытой системой. Поэтому оно — лишь переходный этап на пути к полноценному акционированию, при котором значительная часть акций распределяется между работниками, остальное же могут приобрести те, кто пожелает. К такому акционированию мы и стремимся.

— Но ведь в этом случае возможна ситуация, когда контрольный пакет акций окажется в руках одного лица или небольшой группы...

— Многие этого боятся. А мне кажется, ничего страшного не произойдет.

Работники предприятия вариант, предложенный Тарановым, поддержали. Значит, верят, что, сделав ставку на открытое акционирование, выиграют и станут жить лучше.

Пока что социальные проблемы на "Фандоке" решаются. Не идеально, конечно, с немалым скрипом, но разве может не "скрипеть" отдельное предприятие, если стонет и гнется под напором жестокого кризиса вся экономика нашего молодого государства? Во всяком случае, бобруйские деревообработчики неплохо решают такую, например, болезненную проблему, как обеспечение жильем. Если в 1985 году на "Бобруйскдреве" новоселья справляли те, кто стал на очередь в 1969-м, то сейчас "Фандок" дает квартиры очередникам 1984-го. А в будущем году собираются заселить 36 домов коттеджного типа, строящихся на большом пустыре неподалеку от комбината.

Совет Министров в этом году выделил бобруйским деревообработчикам 36,3 млн. долларов из денег, полученных от Австрии по линии межправительственного кредита. Условия кредита чрезвычайно льготные для фандоковцев: средства выделены под 12 процентов годовых, причем первый взнос бобруйчане должны будут внести лишь через полгода после поставки им последней партии импортного оборудования, для закупки которого и нужны эти самые доллары. После технической реконструкции, по расчетам специалистов, один только завод столярных и мебельных плит будет давать прибыль 2 миллиарда рублей в год против нынешних 200 миллионов.

Вообще же полученное от правительства валютное вливание отнюдь не свидетельствует о том, что отношения между бывшим "Бобруйскдревом", который теперь вполне может рассматриваться как частная фирма, и государственными структурами идеальные. У Владимира Таранова, например, есть возражения по поводу проводимой Национальным банком политики кредитования предприятий в ее нынешнем виде.

— Поймите, — убеждает руководитель "Фандока", — дело не только и не столько в высоких налоговых ставках. А в том, что государство не делает сейчас почти никакой разницы между теми предприятиями, которые работают себе и ему в убыток, и теми, кто, как мы, приносят прибыль. Ведь такие производители, у которых есть постоянный валютный доход, платят налоги, делают обязательные отчисления в пользу государства, то есть приносят и ему, государству, заметную пользу! Так неужели нельзя ввести определенные льготы, дополнительные стимулы для того, чтобы поощрять именно эти передовые производства?

Или возьмем деятельность государственных контрольных органов. У нас, например, недавно работали представители управления экономического контроля Могилевской области. Перелопатили всю документацию, влезали во все мелочи... Злоупотреблений не обнаружили. Но возникает вопрос: а вправе ли государственные контрольные органы вмешиваться во внутренние дела негосударственных фирм во всем? Главное для государства, как я полагаю, — это получить с нас причитающееся ему и при этом проверить, не припрятали ли мы что-нибудь от его бдительного ока. Но все остальное — это уже, простите, наши собственные проблемы!

Часто мы сокрушаемся по поводу того, что рыночные реформы в Беларуси почти не движутся. Однако опыт "Фандока" убеждает, что перемены есть.

Супольная заява

Аб захаванні грамадскага адзінства

Эканамічны і палітычны крызіс, у якім апынулася Беларусь, відавочны: спыняюцца прадпрыемствы, вымушана не працуюць людзі. Кіраўніцтва краіны, выбранае і прызначанае ў часы СССР і панавання КПСС, аказалася няздольным праводзіць эканамічныя рэформы і кіраваць новай незалежнай дзяржавай. Стары здыскрэдытаваны рэжым стаў на шлях адмаўлення ад нейтралітэту, ад прагрэсіўных рэформ, ад незалежнасці Беларусі, на шлях супрацоўніцтва з рэакцыйнымі, камуністычнымі, імперскімі коламі Расіі. Гэтыя колы зацікаўлены ў тым, каб захаваць у Беларусі расійскія войскі, паласу супрацьпаветранай і супрацьракетнай абароны Масквы, базы стратэгічных і тактычных ракет — фактычна пакінуць Беларусь у стане краіны-заложніцы.

Сутнасць змовы ў тым, каб, штучна стварыўшы эканамічныя цяжкасці, прымусіць Беларусь уступіць у сістэму калектыўнай бяспекі і ў вайсковы саюз з Расіяй, ліквідаваць нашу дзяржаўную незалежнасць. Выкарыстоўваецца паліўна-энергетычны шантаж і ствараецца штучны дэфіцыт нафты; адбываецца грубы націск на беларускую фінансава-крэдытную сістэму; арганізуюцца розныя палітычныя акцыі.

У Беларусі ніколі не было міжнацыянальнай варажнечы, і шчасце наша ў тым, што яе няма і цяпер, у няпростыя крызісныя часы. Але пракамуністычныя, праімперскія сілы не трацяць надзеі справакаваць у Беларусі сутычкі на нацыянальна-моўнай глебе, унесці ў краіну нестабільнасць і стварыць такім чынам падставы для замацавання таталітарнага імперскага рэжыму.

Раздзімаецца надуманая праблема дзяржаўнага двухмоўя. Чарговай спробай распаліць напружанасць стала задума правядзення "кангрэса народаў Беларусі", з якой выступілі арганізацыі камуністычнага ды імперскага кірунку, аб'яднаныя ў "Народное движение Беларуси". Сама назва меркаванага мерапрыемства выклікала абурэнне сваёй правакацыйнасцю. Бо народ Беларусі — адзіны, ён не дзеліцца па этнічна-моўных прыкметах; народ Беларусі — гэта ўсе мы разам: і беларусы, і прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Нездарма, атрымаўшы адмову з боку арганізацый нацыянальных меншасцей, ініцыятары мерапрыемства вымушаны былі ўнесці змену ў яго назву (кангрэс не "народаў", а "народа Беларусі").

Адсутнасць паўнамоцнага прадстаўніцтва ператварае гэту акцыю ў палітычны фарс. Арганізатары "кангрэса" нікога, акрамя саміх сябе, не прадстаўляюць, аднак збіраюцца прыняць на ім патрабаванне аб скасаванні незалежнасці нашай краіны праз канфедэрацыю з Расіяй. Але ж сапраўдную думку народа аб будучыні нашай краіны ўжо выказаў прадстаўнічы З'езд беларусаў свету, што нядаўна адбыўся ў Мінску.

Уступіўшы ў канфедэрацыю з Расіяй, Беларусь непазбежна будзе зацягнута ў бясконцыя і крывавыя войны. Але новыя Афганістаны не патрэбны ніводнаму жыхару Беларусі.

Мы пярэчым спробам знішчыць незалежнасць нашай краіны і перакрэсліць надзею на лепшае ў нашага народа. Мы патрабуем спыніць правакацыйныя намаганні перасварыць людзей Беларусі.

Мы выступаем на незалежную Беларусь, якая мае добрыя дачыненні з усімі суседнімі краінамі і супрацоўнічае з імі на двухбаковай аснове. Мы выступаем за Беларусь, дзе будуць гарантаваны правы чалавека кожнай нацыянальнасці.

Ад Беларускага народнага фронту "Адраджэнне" — Зянон ПАЗЬНЯК
Ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады — Алег ТРУСАЎ
Ад Згуртавання беларускіх татар "Аль-Кітаб" — Барыс ШАБАНОВІЧ
Ад Саюза палякаў Беларусі — Тадэвуш ГАВІН
Ад Свабоднага прафсаюза Беларусі — Генадзь БЫКАЎ
Ад Асацыяцыі ўкраінцаў Беларусі "Ватра" — Багдан МІХАЙЛЮК
Ад Беларускай сялянскай партыі — Іван НІКІТЧАНКА
Ад Аб'яднання беларускіх яўрэйскіх арганізацый і суполак — Леанід ЛЕВІН
Ад Таварыства немцаў Беларусі "Адраджэнне" (Беларускага цэнтра нямецкай культуры) — Аляксандр МАЙСНЭР
Ад Беларуска-Літоўскага задзіночання — Ян ВОЙНІЧ
Ад Жаночага хрысціянска-дэмакратычнага руху Беларусі — Людміла ПЕЦІНА
Ад Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" — Ганна СУРМАЧ
Ад Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі — Станіслаў ГУСАК
Ад Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі — Алесь АПРЫШКА

26 жніўня 1993 г.
г.Мінск.

Депутат — депутатам

Вашу б энергию да в мирных целях!

Виктор АЛАМПИЕВ,
народный депутат Республики Беларусь

Вечером 16 августа 1993 года Белорусское телевидение сообщило чуть ли не о героическом подвиге, совершенном группой добровольцев, членов нашего Верховного Совета Республики Беларусь в Москве. Кто же они? Три активиста из самого-самого "беспартийного" депутатского объединения "Беларусь" в Верховном Совете — Г.Козлов, Н.Скорынин и И.Трусов. И с ними А.Лукашенко, вроде не состоящий на учете ни в одной из фракций, хотя в свое время принимал активное участие в создании фракции "Демократические реформы", в которую входили коммунисты-перестройщики.

Движимые, судя по их заявлениям, искренним желанием принести пользу своему Отечеству, они вступили в переговоры с теми силами, которые противостоят президенту России. И что вы думаете? Договорились!

Вот только, анализируя информацию об этих переговорах, напрашивается вопрос: "Чего тут больше проявилось — тактики, стратегии, благоразумия или божьего наказания?"

В то время как представители нашего правительства ведут сложные переговоры в Москве с правительством России, главный советник нашего премьера Н.Скорынин и сотоварищи договариваются с Русланом Имрановичем, не дав ему даже спокойно доболеть, и решают за один день "все" проблемы республики. Вот только будет ли такая самодеятельность на пользу республике, покажет ближайшее время.

Оказывается, до чего все просто. Стоило четырем народным депутатам, представляющим самих себя, появиться в Москве, тут тебе и дополнительные деньги в любом виде, и краны все открыты. А что будет, если Верховный Совет десантирует в Москву почти 100 таких групп? Тут уже точно центр изобилия переместится в Беларусь, и Россия у нас будет просить энергоносители.

Оказывается, что наше правительство у щедрой и бескорыстной России мало просит. Наши добровольцы готовы взять больше. Им все равно, сколько брать. Что для них, "наших спасителей", значит, что за два года долг на каждую нашу душу уже превысил пятьсот тысяч рублей. Брать так брать! Не беда, что наши дети и внуки потом будут нас проклинать за широкую натуру и барские замашки.

И если учесть, что бесплатный сыр бывает только в мышеловке, то напрашивается вопрос: "Чем, товарищи, рассчитываться думаете?"

Какие обещания могли так сильно смягчить сердце Руслана Имрановича? Мне кажется, что только обещание приступить к разрушению Договора об СНГ. (Такой вариант в прессе высказывается.) А это означает, что в достигнутых договоренностях стала разменной монетой независимость нашего государства. Страшно становится от мысли, если граждане республики, которые перенесли трудности и последствия войны, не сравнимые с нынешними, поддадутся на демагогию, позволят себя обмануть и своими руками уничтожат независимость своего государства.

Все же я верю, что большинство хорошо знает цену независимости, за достижение которой многие народы расплачиваются жизнями своих лучших сынов. Я не верю, что народ Беларуси глух и слеп и ничего не понимает.

Однако может случиться, что депутатское объединение "Беларусь", сомкнувшись с аналогичными "беспартийными" структурами в России, закусив удила и сосредоточив всю свою необузданную энергию, все же завалит СНГ и потянет нас в единое государство, тогда уж нам точно беды не миновать и до распада России, может, останется один шаг. Ведь им, в принципе, не важно, во что, куда, с кем и для чего, но главное вступить, причем на любых условиях, что очень похоже на попытку снять с себя ответственность за состояние дел в республике.

Уважаемые товарищи! Вы на деле проявили себя не сторонниками проводимых реформ. Вы всегда выделялись своей активностью среди тех, кто выступал и против нашей государственности, и против права частной собственности на землю, и против приватизации. Вы были среди тех, кто втянул республику в бессмысленный Договор о коллективной безопасности, против которого выступали народные депутаты, представляющие демократические движения и предупреждавшие, что этот договор несет нашему народу лишь шанс участвовать в чужих войнах. События на таджикской границе не заставили себя ждать. Сыны России, участницы этого договора, уже гибнут. Куда вы тянете теперь? Неужели вы не видите, что в России без нас уже 88 субъектов Федерации? Причем некоторые из них вынашивают идею суверенитета — кто пока в составе России, а кто уже и вне ее. Неужто и впрямь не понимаете, что, идя к мировым ценам на энергоносители, Россия не будет продавать их нам себе в убыток. Разве можно в такой ситуации рассчитывать на дешевые ресурсы, даже будучи в составе России на правах не то что области, но даже района?

Сколько же можно жить иллюзиями?

Не лучше ли нам сосредоточить свою энергию на контроле за исполнительными структурами и заставить их работать и уважать принятые законы? В республике вдобавок к кризису экономики природная катастрофа, и тут не отдыхать нужно, а работать днем и ночью.

Мы за два года залезли в долги и кредиты, а нам, получается, некогда разобраться. Почему внешнеторговый оборот в 1992 году снизился наполовину при спаде производства на 16 процентов? Почему экспорт снизился на 600 миллионов долларов США при наличии конкурентной продукции? Почему разрушены рынки азотных и калийных удобрений и республика несет огромные потери в валюте? Вопросы, вопросы...

А вот еще "загадка природы". Почему сейчас в Прибалтике нет проблем с бензином, а у нас она существует долгие годы? Мы испытывали трудности с горючим даже тогда, когда в 1990 году у нас в расчете на душу населения израсходовано нефти, включая газовый конденсат, 3853 килограмма. (Для сравнения: в США — 2663 кг, во Франции — 1236, Великобритании — 1326, в ФРГ — 1189 кг — данные за 1989 г.) В прошлом году у нас в республике израсходовано нефтепродуктов в расчете на душу населения 2135 кг, а в текущем будет израсходовано около 1650 кг. Так в чем же дело?

Кто с этим будет разбираться? Или, может, кто-то рассчитывает обвинить в развале экономики республики оппозицию БНФ, которая в своих рядах насчитывает 30 народных депутатов из 345 членов Верховного Совета? Не выйдет, уважаемые товарищи!

Вачыма мастака

Малюе Алег ПАПОЎ.

Ну і ну!

На сустрэчу з папам рымскім па... квоце

Многім з тых нашых землякоў, хто разлічваў паехаць у пачатку верасня ў Літву на сустрэчу з папам рымскім Іаанам Паўлам II, відаць, давядзецца застацца дома. Як паведаміла газета "Пагоня", што выходзіць у Гродне, у пісьме, якое паступіла з Вільнюса на адрас мясцовай каталіцкай епархіі, гаворыцца, што для Беларусі ўстаноўлена своеасаблівая квота "ўсяго на 4 тысячы паломнікаў".

Выконваючы просьбу вернікаў, кіраўніцтва епархіі звярнулася ў епіскапат Літвы з просьбай дабівацца ад урада адмены ўказаных абмежаванняў. Ці ўстаноўлены яны для іншых рэгіёнаў блізкага замежжа, не паведамляецца.

Як стала вядома карэспандэнту Белінфарма з той жа крыніцы, на сустрэчу з кіраўніком рымска-каталіцкай царквы запрошаны хор старажытнай духоўнай музыкі "Паходня" з Гродна. Чакаецца, што з яго ўдзелам адзін са святароў фарнага касцёла, што знаходзіцца ў абласным цэнтры, правядзе ў Вільнюсе ў прысутнасці папы рымскага богаслужэнне на беларускай мове.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.
г.Гродна.

Пытанні ў антракце

Калі чорная кошка на карысць

Выключна "Віскасам" харчуюцца кошкі Юрыя Куклачова, народнага артыста Расіі, уладальніка Срэбранага клоуна, мастацкага кіраўніка Тэатра кошак у Маскве. Некалькі дзён таму ў мінскім Доме афіцэраў адбылося свята для дзяцей і дарослых — "Кашачы вернісаж".

— Я сто гадоў буду жыць, — сказаў нашаму карэспандэнту самы вялікі "обожатель кошек", — таму што мастацтва радаваць дзяцей — вечнае. Гэта рэдкі жанр. Дзіцячая мара зрабіцца клоунам здзейснілася — усе людзі свету разумеюць мяне без слоў. Я шчаслівы чалавек...

— З кім вам працей знаходзіць паразуменне: з кошкамі ці з людзьмі?

— Канешне, з кошкамі. Самыя лепшыя сябры — гэта кошкі.

— Акрамя кошак у вашым тэатры ёсць і два сабакі — Паштэт і Кракадзіл... Як яны ўжываюцца?

— Вельмі цудоўна! Усе пяцьдзесят нашых кошак жывуць у кашэчым доме — памяшканні прыкладна ў 100 квадратных метраў.

— І, безумоўна, кошкі-артысты выбіраюць "Віскас"?

— І ўжо даўно. Адной бляшанкі хапае адной кошцы на два дні. Гэта нават выгадна, калі ўлічыць, што за кілаграм мяса трэба аддаць 2 тысячы рублёў. А замежныя кансервы — вялікая колькасць патрэбных вітамінаў: кошкі здаровыя вырастаюць, не хварэюць.

— Вашы кошкі калі-небудзь бегалі за мышамі?

— Ніколі. Яны мышэй нават баяцца. Калі кот Кузя пабачыў мыш — спужаўся, а Васька пачаў з імі гуляць.

— Колькі гадоў самай старой кошцы ў вашым тэатры?

— Стрэлцы 18 гадоў.

— Юрый, вы выступаеце на сцэне разам з жонкай Аленай. А дзе вашы дзеці?

— Валодзька, Каця і Дзіма? Старэйшы Дзіма — таксама клоун. Робіць ужо свае самастойныя крокі. Кажуць, што няблага атрымліваецца.

— Юрый, што вы робіце, калі чорная кошка перабегла дарогу?

— Гэта мне толькі на карысць.

У "кашэчым" доме гасцявала Таццяна КАЗАК.

Послушайте!

Можно ли узбеку назвать сына по-узбекски?

Пишет вам житель д.Ляховцы Малоритского района Брестской области Тажибаев Салим Хожамбергенович.

Как вы видите, я узбек. Живу в Беларуси с 1987 года. Женился, имею двух сыновей. Последние 2—3 года, когда в бывшем СССР образовались национальные независимые государства, на таких людей, как я, местное население стало смотреть подозрительно. После событий в Бресте в 1992 и 1993 годах, когда кавказские бандиты совершили несколько убийств, вообще пошла какая-то "охота на ведьм". Я даже побаиваюсь один ехать в Брест, мало ли что... И так мне многие неразумные напоминают словами, что я такой-сякой...

Недавно, 28 июля нынешнего года, случилось вообще из ряда вон выходящее. После рождения второго сына я с хорошим настроением поехал в Мокранский сельсовет, чтобы получить свидетельство о рождении. Но секретарь сельсовета, госпожа Осипук Мария Андреевна, на мое желание назвать своего сына по-своему ответила стуком по столу: "Нельзя, не разрешаю". Хочешь получить свидетельство своему ребенку, назови его по-русски, не хочешь — езжай в свою Узбекию или Чучмекию...

Оказывается, она еще отказывала и тем, кто хотел назвать своих дочек именем Олеся. Говорит, что это не белорусское имя! Может, мне в самом деле съездить в Узбекистан, чтобы получить эту картонную бумажку?

Салим ТАЖИБАЕВ.
Малоритский район.

Беларусь — Польшча

Ваенныя кантактаў не губляюць

Як паведамлялася, па запрашэнню Міністэрства абароны Беларусі нашу рэспубліку наведала афіцыйная ваенная дэлегацыя Польшчы на чале з генералам брыгады Тадэвушам Камарніцкім — начальнікам Упраўлення ўзбраення генеральнага штаба Войска Польскага. У ходзе двухдзённых перагавораў з намеснікам міністра абароны Беларусі па ўзбраенню генерал-маёрам Міхаілам Станкевічам, іншымі афіцыйнымі асобамі абмеркавана шырокае кола пытанняў узаемавыгаднага ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва.

Паводле звестак прэс-цэнтра Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, дасягнута дагаворанасць аб правядзенні разлікаў паміж бакамі на аснове ўзаемапаставак абсталявання, запасных частак да тэхнікі і матэрыялаў. Так, на танкарамонтным заводзе ў Барысаве будуць рамантавацца рухавікі для баявых машын пяхоты Войска Польскага. Разгледжаны прапановы палякаў аб пастаўцы іх арміі запчастак і прылад да БМП і інш.

З Польшчы ў Беларусь у сваю чаргу будзе пастаўляцца абсталяванне для кансервацыі баявой тэхнікі метадам сухога паветра. Прымяненне гэтай прынцыпова новай тэхналогіі дасць магчымасць беларускай арміі зэканоміць немалыя сродкі, паколькі ў адпаведнасці з абарончай дактрынай і міжнароднымі дагаворамі рэспубліка працягвае ажыццяўляць значнае скарачэнне Узброеных Сіл. Дасягнута таксама згода аб пастаўцы з Польшчы дэфіцытных акумулятарных батарэй для рознай тэхнікі, якія не выпускаюцца ў нас.

Удзельнікі перагавораў выказалі адзіную думку, што ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай галіне, прадугледжанае пагадненнем аб ваенных кантактах паміж дзвюма краінамі, плённа развіваецца і прыносіць ужо практычныя вынікі.

Белінфарм.

Як захоўваем спадчыну?

Руіны маўчаць...

Мала хто з жыхароў Барысава ведае гэтае месца. Яшчэ менш людзей чулі нешта з яго гісторыі. Між тым адсюль пачынаўся наш горад, тут неаднойчы вырашаўся лёс беларускай дзяржавы (Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага).

Калісьці тут стаяў велічны замак — спачатку драўляны, пасля мураваны. Пра яго ўзгадваецца ў працы італьянскага вайскоўца Гваньіні "Апісанне Еўрапейскай Сарматыі".

Дакладна вядома, што тут доўгі час знаходзілася рэзідэнцыя вялікіх князёў літоўскіх, падпісваліся пагадненні, прымаліся замежныя паслы. У 1514 годзе, падчас бітвы пад Оршай, у замку знаходзіўся Жыгімонт І.

На працягу стагоддзяў замак шмат разоў умацоўваўся, перабудоўваўся і ўрэшце ў XIX стагоддзі быў прыстасаваны пад турму.

Усё, што засталося ад замка цяпер, — гэта руіны царскай турмы, побач з якімі стаяць прыватныя дамы, хлявы і г.д. Ахоўны замкавы роў амаль што цалкам засыпаны. Больш таго, цяпер тут разгортваецца будоўля жылых дамоў для завода агрэгатаў.

Барысаўскай суполкай БНФ з гэтай нагоды была зроблена заява ў пракуратуру горада аб парушэнні Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны". Як і чакалася, ніякіх вынікаў гэта не дало. Па дакументах 1981 (!) года, якія даслалі з Мінска, роў не ўваходзіць у ахоўную зону. У той час нашу гісторыю і культуру партыйныя ўладары наогул не збіраліся захоўваць. Таму забудову вырашылі працягваць. Цяпер людзі жывуць нават у межах ахоўнай зоны.

Такое не магло б здарыцца ні ў адной краіне, дзе свята ўшаноўваюць памяць аб продках. На Беларусі ж, якая цудам захавала невялікую колькасць архітэктурных помнікаў старажытнасці, клапаціцца пра гістарычную спадчыну патрэбна асабліва. Тое, што цяперашнія гарадскія ўлады не жадаюць гэта рабіць, — відавочна. Хацелася б, каб Камісія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны звярнула ўвагу на гэты помнік. Калі б яго аднавіць, ён выглядаў бы не менш уражальна, чым Лідскі ці Мірскі замкі, і для турыстаў адкрылася б яшчэ адна старонка слаўнай гісторыі нашай Беларусі.

Наталля КАЗЛОВА,
студэнтка Белдзяржуніверсітэта.
г.Барысаў.

Горка

Франтавікі, беражыце медалі!

Ігар ФЕЛІКСАЎ

Памятаю дзіцячыя, амаль падсвядомыя, уражанні ад дотыку да воінскіх узнагарод. У дзеда, які скончыў сваю вайну ў Кёнігсбергу, іх было няшмат, але кожная мела сваё месца. І не абавязкова на святочным пінжаку, а хутчэй у памяці франтавіка, які чэсна прайшоў воінскі шлях салдата ад першага свайго бою да апошняга. А было ў гэтага чалавека за плячамі нямала. Ніколі, здаецца, ён не крыўдаваў, што недзе не заўважылі, недзе абразілі. І тое, што меў, не заўсёды чапляў на лацкан. Але ляжалі ягоныя адзіныя сведкі тагачаснай пары ў акуратным месцы пад пільным наглядам вопытнага гаспадарскага вока.

Прыеду, бывала, зусім малым на вёску на выхадныя, скончыцца поўны сялянскіх клопатаў дзень і папрашу, калі выберу добрую хвіліну, Канстанцінавіча расказаць пра свой баявы шлях. І л'ецца пад добры настрой яго апавяданне то пра медаль "За адвагу", то пра ордэн "Чырвоная Зорка". А то аднойчы пачуў, як не далі Героя палітычна несвядомаму байцу, які прайшоў праз нямецкі палон.

І не тое, што падараваць, дакрануцца да тых узнагарод дазволу папросіш.

...Натоўп роў і гойдаўся, чарга за каўбасой працягнулася ў некалькі радоў па ўсім аддзеле. Стаіш і думаеш толькі аб тым, каб хутчэй скончылася гэтае прыніжэнне. Апускаю неўзабаве вочы і бачу пад абцасам чыйгосьці чаравіка медаль. Ляжыць тут невядома чаго, нягледзячы на бруд навакольны, адлівае жоўтым бляскам. Нібы страціўшы прытомнасць, хуценька падымаю яго з падлогі. "Што ж ты тут, страціў свайго гаспадара?.." Азіраюся ў пошуках таго, каму б ён мог належаць. Але вакол толькі маладыя твары. У разгубленасці не ведаю, што рабіць, і пытаюся ў тых, хто побач, ці не бачылі гаспадара. Ціснуць плячамі. Так і прастаяў амаль усю чаргу з узнятай рукой з медалём у надзеі, што вернецца той, хто яго згубіў.

Дачакаўся, што падышоў немалады ўжо чалавек і грэбліва спытаў:

— Колькі ты хочаш за яго?

Ад нечаканасці страціў мову. Праз некалькі хвілін здольны быў нешта няскладна растлумачыць. Стары адышоў. А я ўжо не змог вярнуць душэўнай раўнавагі.

Хто ж мы такія, калі без сораму гандлюем людскімі лёсамі, калі шамаценне купюр засціла нам вочы, а ў чарзе за папяровай каўбасой, у байцы за пайкай зрываем узнагароды з ветэранаў? Няўжо пераварыліся ў нелюдзяў, у сапраўдных монстраў, калі кавалачак хвіліннага дабрабыту стаў даражэй за крывавую памяць?

Пячэ руку юбілейны медаль удзельніка працоўнага фронту да 30-годдзя Перамогі. Вочы глядзяць на гэты метал коштам у чалавечыя кроў і пот з надзеяй на тое, што знойдзецца гаспадар.

Адгукніся, ветэран, які згубіў 21 жніўня ў мінскім універсаме "Сталічны" гэты кавалачак памяці!

Тэлефон у рэдакцыі 29-61-04.

Навіны двума абзацамі

"Люлечка" едзе за мяжу

У Малдову на міжнародны фестываль фальклору выехалі адразу тры самадзейныя калектывы Асіповіцкага раёна — народныя ансамблі беларускай песні і музыкі "Люлечка", "Вяселле" і музыканты сям'і Шамаковых з вёскі Дрычын. Розныя па складу выканаўцаў, яны аб'ядналі ўлюбёную ў беларускую народную музыку моладзь і людзей сталага ўзросту, якія захавалі народныя традыцыі.

На міжнародным фестывалі, у якім удзельнічаюць выканаўцы з краін Еўропы, Азіі і былога СССР, асіповіцкія артысты будуць прадстаўляць беларускі нацыянальны фальклор.

Хто не рызыкуе, той не есць тушонку

Расшырыў рынкі збыту сваёй прадукцыі чачэрскі калгас "Сцяг камунізму", цяпер тушонку і кашу з грэцкіх круп з мясам можна набыць не толькі ў яго фірменным магазіне, але і ў Гомелі, Жлобіне, Бабруйску.

Гэта — аўтарытэтная ацэнка калгаснаму кансерваваму заводу, што рызыкнуў заваяваць пакупнікоў у гарадах з добра развітай дзяржаўнай мясаперапрацоўчай прамысловасцю.

Да мэблі адзін толькі крок

Менавіта такі крок вырашылі зрабіць на шклоўскім ільнозаводзе. Перабудова пацясніла льнаводства ў калгасах і саўгасах. Пасевы гэтай культуры пачалі скарачацца. А ў выніку на перапрацоўчым прадпрыемстве вызваліліся вытворчыя плошчы. Вось іх і ўзяліся рэканструяваць пад мэблевы цэх па выпуску кухонных гарнітураў і прыхожых. Шчасце, кастрапліты выпускаюцца побач, у сваім жа цэху. Пакуль што іх бяруць будаўнікі, мэбліроўшчыкі іншых прадпрыемстваў.

Але ў рыначных умовах больш выгадна прадаваць не матэрыялы, а гатовыя вырабы. Да таго ж вытворчыя магутнасці будуць задзейнічаны, і людзі атрымаюць работу. У справу пойдзе ўся кастрыца, замкнуўшы кола безадходнай тэхналогіі. А на тым месцы ля Дняпра, дзе раней гарэлі горы гэтай кастрыцы, будзе закладзены парк.

Белінфарм.

Журналистское расследование

Выстрел ва-банк

Виктор ЛЕЩЕНКО

По меньшей мере три предпринимателя, имевших отношения с одной российской авиакомпанией, были убиты. Последним — глава белорусского концерна "Коминвест" Александр Лисничук. Что это — роковая случайность?

Ответить на вопрос, увы, пока можно приблизительно с таким же успехом, как предсказать свою судьбу или угадать, под каким наперстком шарик.

Впрочем, все по порядку.

Вокруг убийства Лисничука всплывают весьма щекотливые факты. Можно сказать, даже сенсационные. Но пока ни прокуратура, ни МВД, насколько мне известно, никому не предъявили обвинения. Поэтому некоторые названия фирм и фамилии оглашены не будут.

Суть же дела заключается в пяти миллиардах рублей.

Минувшей осенью председателю правления одного из белорусских банков позвонил знакомый коммерсант Омар, обосновавшийся в России. После обоюдного приветствия осторожно спросил:

— Кредит бы взял. Не поможете?

— Попробую, но только под закупку энергоносителей.

— Нефть, мазут. Все, что надо.

Вскоре в Национальный банк направляется документ с просьбой предоставить пять миллиардов рублей по целевому назначению. Там, видимо, сочли такую сумму великоватой для коммерческой структуры, а потому выделили всего два миллиарда. По тем временам — около пяти миллионов долларов. Итак, в ноябре на расчетный счет авиатранспортной компании "Шота", прописанной в Москве, из Беларуси пришли... 4 миллиарда рублей. Но как же так, изумится внимательный читатель, ведь Национальный банк сначала давал вдвое меньше? Секрет прост, как таблица умножения,— к сделке подключились еще один банк и концерн "Коминвест".

В столь бурной предпринимательской активности, понятно, ничего противозаконного нет. Даже, на первый взгляд, наоборот — огромное желание помочь своей республике не испытывать нефтяного голода. И тот факт, что кредит российской фирме дан архивыгодный — на год и под 35 процентов — тоже криминалом не отдает. Ну, чего в бизнесе не бывает! И только дальнейшая судьба наших денег заставляет задуматься: так что же это была за сделка?

